ПРА БЕСПІЛОТНІК І САМАЛЁТ 2

ЯК РАСПАЗНАЦЬ У СЯБЕ АНЕМІЮ? 4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 САКАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 45 (29925)

КАРОТКА

- **Беларусь з'яўляецца лідарам у ЕАЭС па агульным узроўні гендарнай роўнасці.**
- У Беларусі ў 2022 годзе ордэн Маці атрымалі 738 шматдзетных жанчын.
- **Камп'ютарны тамограф устанавілі ў Ляхавіцкай ЦРБ.**
- Беларусь уваходзіць у 50 найлепшых краін свету па вядзенні цяжарнасці і арганізацыі родаў.
- **Дзякуючы праграме скрынінгу дыягностыка анкалагічных захворванняў на ранніх стадыях дасягае 70 %.**
- Мінпрацы: пытанне скарачэння дэкрэтнага водпуску ў Беларусі не прапрацоўваецца.
- **Фінал конкурсу «Каралева студэнцтва — 2022» адбудзецца ў Мінску 23 сакавіка.**
- Беларускі саюз жанчын аб'яўляе збор сродкаў для набыцця лекаў для дзяцей з жыццепагражальнымі захворваннямі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«У нас, нягледзячы на тое, што працягласць дэкрэтнага водпуску — да дасягнення дзіцем узросту трох гадоў, жанчына ў любы момант можа выйсці на працу. За ёй захоўваецца працоўнае месца. І, як правіла, жанчыны выходзяць крыху раней, пачынаючы з двухгадовага ўзросту дзіцяці. Гэта звязана ў тым ліку і з паступовай адаптацыяй дзіцяці да дашкольнай установы. Што да скарачэння дэкрэтнага водпуску, то пакуль такое пытанне не прапрацоўваецца».

ЯНЫ ЗАХОЎВАЮЦЬ І АБАРАНЯЮЦЬ

Напярэдадні Дня жанчын у Палацы Незалежнасці панавалі прыгажосць і мужнасць. Па традыцыі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным жанчынам з розных сфер і генеральскія пагоны прадстаўнікам вышэйшага афіцэрскага і начальніцкага складу.

Фота БелТА.

Намеснік дырэктара цэнтра суправаджэння банкаўскіх аперацый Белаграпрамбанка Святлана ПАЛУЛЕХ узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі".

«Цяжка прыдумаць больш прыдатнае па духу і па сэнсе мерапрыемства для Году міру і стваральнай працы, чым наша сённяшняя цырымонія. Па добрай традыцыі ў гэтыя першыя вясновыя дні мы ўшаноўваем самых паспяховых жанчын краіны і самых мужных воінаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён растлумачыў, чаму ў нашым грамадстве асаблівай павагай карыстаюцца жанчыны, якія выбралі для сябе нялёгкі шлях мацярынства, — таму што гэта найвышэйшае прызначэнне і сэнс жыцця, сцвярджэнне непарушных чалавечых каштоўнасцяў, усяго існага на зямлі, гэта аснова. «Менавіта на бескарыслівай матчынай любові, вялікіх жаночых сэрцах, іх невычэрпнай энергіі ўсё і трымаецца на нашай планеце.

Таццяна АБРАМУК, Вольга БУДНІК і Настасся ПАНАСЕНКА.

Дарагія жанчыны, прысутныя тут і тыя, хто нас сёння пачуе, сардэчна вітаю ў вашым твары ўсіх мам нашай краіны! Ніскі паклон вам за ваш мацярынскі подзвіг!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што нароўні з мужчынамі жанчыны паспяхова развіваюць навуку і тэхналогіі, умацоўваюць прамысловы патэнцыял, забяспечваюць харчовую і фінансавую бяспеку краіны, будуюць дамы, ствараюць творы мастацтва, вучаць і лечаць людзей. А яшчэ праслаўляюць нашу Радзіму на самых прэстыжных форумах і вядучых тэатральных сцэнах свету, захоўваюць і памнажаюць культурную спадчыну Беларусі.

«Ды і ўсё, што мы, мужыкі, робім у гэтым жыцці, — дзеля вас, — заўважыў Прэзідэнт. — Сёння ў гэтай зале мы па традыцыі ўшаноўваем і сапраўдных мужчын — афіцэраў, генералаў, якія таксама з'яўляюцца ўвасабленнем Году міру і стваральнай працы, таму што пад іх надзейнай абаронай нашы суверэнітэт і бяспека. Прасцей кажучы, наша ціхае і спакойнае жыццё». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў такія часы, як цяперашнія, людзі пачынаюць разумець сапраўдную цану, здавалася б, простым рэчам — міру, парадку, спакою.

«Узнагароды, якія ўручаюцца, і новыя пагоны — гэта прызнанне вялікіх асабістых заслуг перад Айчынай, пацвярджэнне ўзроўню вашай прафесійнай вывучкі і знак высокага даверу беларускага народа. Упэўнены, вам таксама добра вядома, што наш з вамі абавязак — забяспечыць надзейны мір на беларускай зямлі. Забяспечыць, чаго б гэта нам ні каштавала! Веру ў кожнага з вас, у нашу армію і ўсіх тых, хто сёння носіць пагоны», — сказаў беларускі лідар. Ён падзякаваў за сумленную працу, прафесіяналізм, вернасць абавязку і патрыятызм.

«Шчыра віншую з высокімі ўзнагародамі і званнямі. Нашых паважаных жанчын — з надыходзячым святам вясны. Жадаю ўсім новых вялікіх поспехаў у працы і асабістым жыцці, моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Святочнае

МЕСЦА, ДЗЕ ЖЫВУЦЬ КВЕТКІ

8 Сакавіка — адзін з тых дзён, калі ўсе жанчыны свету купаюцца ў пяшчоце, любові і каляровых кампліментах. Гарэзлівыя цюльпаны, загадкавыя ружы з'яўляюцца неад'емным элементам свята вясны. І калі для гараджан святочны дзень заканчваецца разам з перагорнутым лістом календара, для кветкаводаў Віцебскага зелянбуда ён доўжыцца круглы год. Мы завіталі ў цяпліцы прадпрыемства і знайшлі сакрэт жаночага настрою.

Марозная раніца, у чаканні запрашэння ў ружовы прыстанак прыходзіцца крыху пераступаць нагамі — на вуліцы мінус 15. «Праходзьце хутчэй, — ласкава запрашае **дырэктар ДУ «Віцебскі зелянбуд» Алег СЯНЬКОЎ.** — Зараз будзе цёпла, вось убачыце». І пачынаецца духмянае падарожжа па пяці цяпліцах прадпрыемства.

Сёлета віцебскія майстры азелянення да 8 Сакавіка вырасцілі 10,5 тысячы цюльпанаў і каля 30 тысяч руж. І калі першыя ўбачыць не выпала — каляровыя прадвеснікі вясны з пачатку сакавіка занялі сваё месца на прылаўках, — ружы, якіх тут налічваецца 9 сартоў, калыханнем далікатных пялёсткаў запрашалі ў госці.

СТАР. 3

Дырэктар Віцебскага зелянбуда Алег СЯНЬКОЎ і намеснік дырэктара Валянціна ШЭНДЗЮКОВА.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2023 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

Як затрымлівалі ўкраінскага тэрарыста

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка падрабязна расказаў падчас цырымоніі ўзнагароджання. Прэзідэнт адзначыў, што на святочнае мерапрыемства мужчыны ў пагонах прыйшлі не з пустымі рукамі, а з падарункам, які ён назваў неверагодным. «Яшчэ раз прашу прабачэння, што я адыходжу ад афіцыёзу і проста напярэдадні свята расказваю вам не як Прэзідэнт, а як звычайны чалавек аб гэтым выключным падарунку, імя якому «неверагоднае», — падкрэсліў ён.

Як усё пачыналася

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што пачатак усяму быў пакладзены восем месяцаў ці паўгода таму, дакладна яшчэ будзе высветлена. Месца падзей — Кіеў. «Служба бяспекі Украіны, кіраўніцтва ЦРУ ці то збоку, ці то за спінай распрацоўваюць аперацыю супраць Рэспублікі Беларусь. Быў падрыхтаваны тэрарыст. Ён расіянін, з расійскім пашпартам, мае ўкраінскі пашпарт. Нарадзіўся ў Крывым Рогу, жыў у Крыме, сваякі ў Аўстрыі некаторыя, некаторыя засталіся ў Кіеве. Ён быў завербаваны спецслужбай Украіны ў 2014, здаецца, годзе. Айцішнік ці добра разбіраецца ў ІТ-тэхналогіях. Рыхтаваўся для здзяснення тэрарыстычных актаў», — падзяліўся падрабязнасцямі ён.

Прэзідэнт нагадаў аб тэракце супраць расійскіх самалётаў на аэрадроме ў Энгельсе, які быў здзейснены некалькі месяцаў таму. Былі пашкоджаны расійскія самалёты стратэгічнага прызначэння. «Гэта было даручана не яму (дыверсанту, закінутаму ў Беларусь. — **Заўв.**). Гэта было даручана іншым групам, старанна падрыхтаваным разам з нашым так званым тэрарыстам на тэрыторыі Украіны. Рыхтавалі дыверсанта прадстаўнікі СБУ, выкарыстоўваліся самыя высокія тэхналогіі. Тое, што мы ўбачылі, рэалізоўваючы аперацыю ў Беларусі, — сапраўды нешта неверагоднае. Здзейнічалі самыя высокія тэхналогіі. Ён быў навучаны ўсяму гэтаму не за адзін месяц. Пасля падрыхтоўкі ён быў маршрутаваны (так гавораць у КДБ) на нашу тэрыторыю», — расказаў Прэзідэнт.

«У Беларусі так не бывае»

Трапіць у Беларусь праз граніцу з Украінай дыверсант не мог, яна закрыта. Таму быў абраны маршрут Варшава — Брэст, Варшава — Лодзь — Рыга — Пскоў і затым Мінск. Прэзідэнт даручыў старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Анатолю Лапо знайсці беларускага пагранічніка, які не прапусціў тэрарыста на тэрыторыю Беларусі пад Брэстам. «Пад рознымі выкрутамі, слязамі і плачам, што, калі ён яго не прапусціць, — бяда будзе з ім ва Украіне. Але наш хлопец малайчына. І хоць па-чалавечы можна было яго зразумець, ён яму сказаў, што ў Беларусі так не бывае: «Вы калі праедзеце ў Беларусь па ўкраінскім пашпарце (у яго два пашпарты: расійскі і ўкраінскі), то я вымушаны вас зафіксаваць тут». Яму гэта не трэба было. Ён вярнуўся ў Варшаву. Яму з Украіны далі запасны маршрут. Як я ўжо сказаў, Варшава — Лодзь — Рыга. І там ён перасек латвійска-расійскую граніцу. Пагранічнікі расійскія, на жаль, прапусцілі яго, хоць не павінны былі гэта рабіць. Ён перамяшчаўся па ўнутраным расійскім пашпарце. У іх ёсць замежны пашпарт. Ён не меў права перамяшчацца праз граніцу, але, тым не менш, перамясціўся ў Пскоў, затым прыехаў на аўтобусе ў Мінск», — расказаў беларускі лідар.

Пра беспілотнік і самалёт

Прэзідэнт не стаў у дэталях раскрываць, як перадаваліся прылады злачынства, гэтыя беспілотнікі. Арганізатары няўдалага тэракта абралі маленькі беспілотнік. «Таму што, калі б яны выкарыстоўвалі вялікі, то сістэмы нашага сачэння, вядома, яго адсачылі б. Але маленькі гэты беспілотнік кітайскай вытворчасці, які прадаецца і ў нашых крамах, мы ўстанавілі, — ён быў прададзены ў ЗША (гэты кітайскі беспілотнік), а потым вярнуўся ва Украіну. І ва Украіне былі задзейнічаны гэтыя два беспілотнікі, навучаны гэты чалавек і іншыя, якія яму дапамагалі», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што пра тое, як беспілотнікі былі задзейнічаны ва Украіне, раскажуць пазней.

«Быў падрыхтаваны гэты тэракт. Вынікі вы ведаеце. На шчасце, самалёт не зведаў нейкіх значных пашкоджанняў, акрамя драпін і адной прабоіны ў корпусе, якая ваеннаму самалёту не перашкаджае выконваць яго абавязкі. Мы вам паказвалі гэты самалёт. Як мне паведамілі, ён нават Прэзідэнта сустракаў, калі я вяртаўся з Пекіна. Тым не менш мы папрасілі расіян, каб яны ўзялі гэты самалёт на абслугоўванне і даслалі нам іншы. Так і адбылося», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, якія задачы самалёт А-50 выконваў у Беларусі. Беларускі лідар папрасіў Прэзідэнта Расіі накіраваць у Беларусь паветраную групоўку для таго, каб ажыццяўляць кантроль па перыметры беларускіх граніц і сумеснай расійска-беларускай групоўцы адпрацоўваць пэўныя навыкі. «Гэты самалёт ніколі не залятаў на тэрыторыю Украіны. Нават не набліжаўся да граніцы Польшчы, Літвы, усіх гэтых нягоднікаў, якія сёння працуюць супраць Беларусі. Мы вельмі акуратна працавалі, нікому не давалі нагоды для гэтага», — сказаў ён. «Пасля здзяйснення тэракта і спробы ўзарваць самалёт (самалёт дарагі, самалёт-разведчык) былі створаны маршруты вывазу яго (тэрарыста) з тэрыторыі Беларусі, для іх гэта быў вельмі каштоўны чалавек», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Як узялі тэрарыста

Яшчэ да камандзіроўкі ў Кітай Прэзідэнт аддаў самыя цвёрдыя распараджэнні сілавікам. «Там я лаяўся на вас і мацюкамі казаў. Гэта абнуляецца сёння. Але не забывайце», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Былі перакрыты граніцы Беларусі. Але асноўная праблема была беларуска-расійская граніца, дзе няма воінскіх падраздзяленняў, ды і граніцы няма паміж Расіяй і Беларуссю. «І галоўнай нашай задачай было не дапусціць пранікнення яго ў Расію, таму што ў вялізнай, бяздоннай Расіі знайсці яго было б вельмі складана. Мы гэта разумелі, а таму былі ўзняты сотні, а можа, і тысячы людзей — ваенных усіх падраздзяленняў, каб закрыць Беларусь», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Выкананы пэўныя дзеянні, разгорнуты антытэрарыстычны штаб пад кіраўніцтвам старшыні КДБ Беларусі Івана Тэртэля. «Правакавалі ўкраінцаў, паказваючы ім, што мы там праводзім нейкія аперацыі. Яны паддаліся на нашы рухі і паказалі фактычна сваімі дзеяннямі, куды і дзе яны хочуць выводзіць гэтага тэрарыста. Натуральна, Лапо прыкрыў граніцу. Яны заўважылі, што праз граніцу ім не прайсці. І пачалі выкарыстоўваць запасны варыянт вываду яго адсюль. Але перш чым выводзіць, трэба было стварыць новы канал», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падзяліўся, што больш за ўсё ў гэтай аперацыі яго ўразіла выкарыстанне найвышэйшых тэхналогій: «Яны стварылі яму спецыяльную праграму (хутчэй за ўсё, ЦРУшнікі — амерыканцы), уручылі спецыяльныя тэлефоны, па якіх яны адсочвалі кожны яго крок у аўдыя- і відэарэжыме. Яны бачылі, куды ён перамяшчаецца, з кім сустракаецца і размаўляе і гэтак далей. Потым паралельны тэлефон. Гэта вельмі важна — другое, што мяне здзівіла. Там мы крышку пракалоліся, калі ён пакінуў гэты тэлефон (нам гэта было невядома) у кватэры, узяў паралельны тэлефон, і ўжо яны ім кіравалі па гэтым тэлефоне. Гэта загад быў СБУшнікаў: калі мы зойдзем у гэтую кватэру па слядах — яны адразу нас убачаць. Так і адбылося. У гэты момант я ўжо, шчыра кажучы, быўшы ў Кітаі, пачаў сумнявацца пасля вашага даклада, што мы яго хутка знойдзем», — расказаў ён. Прэзідэнт прызнаўся, што другім неверагодным здзіўленнем для яго стала тое, што беларускія спецслужбы, аналізуючы тысячы званкоў, перагавораў, сустрэч і размоў розных мярзотнікаў за межамі і ўнутры нашай краіны, вылічылі яго. «Вось проста вылічылі ў кабінеце дзве кропкі. Калі вы зайшлі ў гэтую кропку, калі ён лёг на дно і чакаў новага маршруту, вы яго ўзялі ў першай жа гэтай кватэры — пад Бараўлянамі ў нейкім там асабняку садовага таварыства. У падвале — друкарня з рознага роду анучамі бчбшнымі і іншай літаратурай. З усяго трэба рабіць выснову. Пра што я заўсёды казаў — што нам ніколі нельга супакойвацца», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы іх вылічым усіх і вычысцім з нашага грамадства»

Па яго словах, каманды ішлі ад СБУ збеглым за мяжой (у дадзеным выпадку — у Польшчы), адтуль яны звязваліся (у дадзеным выпадку гэта быў урач) з мярзотнікамі тут і дапамагалі яму хавацца. Прыступ і на пачатковым, і на канчатковым этапе аперацыі. «Бог дапамог, і здарыўся цуд. Дзякуючы нашым аператыўнікам — Камітэту дзяржбяспекі, МУС і пагранічнікам — мы яго вылічылі і затрымалі. На сёння затрыманы больш як 20 саўдзельнікаў, якія на тэрыторыі Беларусі. Астатнія хаваюцца там за мяжой», — падзяліўся падрабязнасцямі кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што распарадзіўся па ўсёй краіне правесці жорсткую зачыстку — каб не было размоў. «Гэта нам урок. Яны схаваліся і сядзяць, нечага чакаюць. Будзе як у 1941 годзе, калі фашысты прыйшлі сюды, ячэйкі гэтыя былі, памагатыя, а потым павязку на руку і дзейнічалі разам з гэтымі фашыстамі. Нічога не змянілася. Таму мы іх мусім знайсці. А ім я хачу сказаць, каб яны рыхтаваліся. Мы ўжо ідзём. Нашы хлопцы ўжо на парозе, няхай рыхтуюцца. Найлепшы варыянт, калі яны прыйдуць самі і здадуцца. Гэта для іх будзе найлепшы варыянт. Мы іх вылічым усіх і вычысцім з нашага грамадства. Яны за гэтыя два з паловай года так нічога і не зразумелі. Яны не зразумелі, што мы да іх па-людску: калі адумаліся — вяртайцеся. І гэта нічога не адмяняе, ёсць там ачмурэлыя, адурманеныя — няхай вяртаюцца. Заявы ўжо паступаюць. Тыя, хто асабліва зараз здзяйсняюць такія правапарушэнні, з'яўляюцца памагатымі тэрарыстаў — мы іх знойдзем», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, спробы падарваць самалёт не мелі ніякага ваеннага значэння. І нават калі б нешта здарылася з гэтым самалётам, — ён не адзіны. Усё было разлічана на сродкі масавай інфармацыі. «Усё было ўвязана як звёны аднаго ланцуга: у нас тэракт у Мачулішчах і ў Бранскай вобласці, каля 40, а можа, больш, мярзотнікаў — зайшлі, расстралялі мірных грамадзян, паранілі дзіця. Гэта былі звёны аднаго ланцуга, каб прадэманстраваць Захаду, на што яны яшчэ здольныя. Грошы патрэбны. А нашы збеглыя разлічвалі атрымаць за гэта фінансаванне», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы даручыў расказаць пра ўсе падрабязнасці ў СМІ: «Пакажыце гэта ўсё ў дэталях, пакажыце агідных гэтых, якія сядзяць у Польшчы і Украіне, якія за пернікі гатовыя знішчаць. Не здраджваць Радзіме, а знішчаць нашых людзей. Мы павінны ў дынаміцы паказаць, як яны крычалі, што «ўсё, ужо тыя, хто ўчыніў у Мачулішчах тэракт, яны ўжо за мяжой». Гэтым самым яны ў нас умацавалі веру ў тое, што яны тут. Калі б былі за мяжой, яны б іх паказалі. Тады я сілавікам сказаў: «Глядзіце, ён тут!» Яны проста пракалоліся, як мудакі апошнія. І мы актыўна пачалі пошукі тут», — заявіў ён.

«Выклік кінуты»

Прэзідэнт канстатаваў, што з усяго павінны быць зроблены высновы. Гэту аперацыю ён назваў добрай, бліскуча праведзенай. «Здзейснена неверагоднае, каб за нейкія 4-5 дзён знайсці памагатых і затрымаць. Знайсці іголку ў стозе сена. Але расслабляцца ні ў якім разе нельга. Выснова адна. Я яшчэ думаў, што Украіне патрэбны мір, што Зяленскі клапоціцца пра свой народ. Прэзідэнт Зяленскі — проста гніда, такія аперацыі не праводзяцца без узгаднення з кіраўніком краіны, з галоўнакамандуючым. Гніда, бо ён бегае вакол Беларусі. Дасылае да нас людзей і просіць: «Давайце заключым пакт аб ненападзе, давайце дамовімся, у нас з вамі няма ніякіх праблем». На што я казаў: «Мы не збіраемся нападаць». — «Не, давайце падпішам дагавор пад заступніцтвам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, што вы на нас не нападзяце». Вы чулі мае ўсе гэтыя заявы. І ў гэты час...» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Выклік кінуты. Я ж ведаю, што яны жадаюць нас уцягнуць у вайну па камандзе амерыканцаў. І калі вы думаеце, што, кінуўшы гэты выклік, вы ўцягнеце нас у вайну заўтра, якая сёння ідзе па ўсёй Еўропе, вы памыляецеся. Я не настолькі дурны і не першы год працую Прэзідэнтам. Яшчэ раз хачу падкрэсліць, асабліва для мясцовых мярзотнікаў і тых, хто ўцёк. Мы ўсіх знойдзем. А збеглым паўтараю: рыхтуйцеся, мы да вас ужо прыйшлі. І не выйце, і не посціцеся ў гэтых месенджарах. У нас нервы моцныя, мы ведаем, што трэба рабіць», — заявіў ён.

Гэта ўвойдзе ў падручнікі

Па выніках правядзення контртэрарыстычнай аперацыі Прэзідэнт прыняў рашэнне ўзнагароджваць дзяржаўнымі ўзнагародамі галоўных дзейных асоб. Старшыня КДБ Іван Тэртэль узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» I ступені, старшыня Дзяржпагранкамітэта Анатоль Лапо і міністр унутраных спраў Іван Кубракоў — ордэнам «За службу Радзіме» II ступені.

Прэзідэнт даручыў усіх, хто ўдзельнічаў у гэтай аперацыі, няхай іх будуць тысячы, прадставіць да дзяржаўных узнагарод: «Каго трэба падтрымаць матэрыяльна, маральна — як заўгодна. Гэтыя хлопцы не павінны быць забытыя. Вы здзейснілі неверагоднае. Гэта ўвойдзе ў падручнікі. Мы не павінны забывацца на такіх людзей».

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

Намеснік начальніка Следчага ўпраўлення КДБ Беларусі Канстанцін БЫЧАК раскрыў журналістам падрабязнасці затрымання ў Беларусі ўкраінскага тэрарыста і яго саўдзельнікаў, паведамляе БелТА.

«Камітэтам дзяржаўнай бяспекі ва ўзаемадзеянні з МУС, ДПК і іншымі праваахоўнымі органамі праведзена маштабная спецыяльная аперацыя, у выніку якой на адной з явачных кватэр затрыманы грамадзянін Украіны Швец Мікалай Уладзіміравіч 1993 года нараджэння, які зрабіў спробу ўчынення акта тэрарызму на беларускім ваенным аб'екце — аэрадроме Мачулішчы ў Мінскім раёне 26 лютага 2023 года. У выніку праведзеных КДБ контрразведвальных мерапрыемстваў устаноўлена прыналежнасць да арганізацыі тэракта аператыўнага складу і кіраўніцтва службы бяспекі Украіны. Выкрыта сістэма вярбоўкі спецслужбамі Украіны ўласных грамадзян для ўчынення актаў тэрарызму на тэрыторыі замежных дзяржаў, устаноўлены арганізацыі прыкрыцця, якія выкарыстоўваліся для іх падрыхтоўкі і навучання, вывучана тактыка прымянення выбуховых рэчываў, механізмы камунікацыі і кіравання агентурай, выкрыты і ліквідаваны каналы эвакуацыі агента», — расказаў Канстанцін Бычак.

Паводле слоў, першасныя следчыя дзеянні даюць магчымасць зрабіць выснову аб задзейнічанні ў падрыхтоўцы акта тэрарызму агентуры спецслужбаў Рэспублікі Польшча з ліку такіх званых збеглых беларусаў — прыхільнікаў насільнага звяржэння канстытуцыйнага ладу, актыўных удзельнікаў падзей жніўня 2020 года. «Аперацыя па пошуку і затрыманні злачынцаў адбывалася пад непасрэдным кантролем кіраўніка дзяржавы, якім неадкладна былі дадзены даручэнні аб перакрыцці дзяржаўнай граніцы і прыняцці іншых вычарпальных мер, накіраваных на выяўленне і прыцягненне да ўстаноўленай адказнасці ўсіх прыналежных да тэрарыстычнай дзейнасці. У выніку выкрыта і ліквідавана агентурная сетка з ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прымалі ўдзел у забеспячэнні дзейнасці агента-тэрарыста, яго легалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і няўдачнай спробе эвакуацыі, — адзначыў намеснік начальніка ўпраўлення. — Як вынікае з матэрыялаў крымінальнай справы, названыя грамадзяне былі прыцягнуты да проціпраўнай дзейнасці размешчанымі за мяжой беларускімі экстрэмісцкімі палітэмігранцкімі цэнтрамі, якія фактычна па заданні ўкраінскіх і польскіх спецслужбаў выкарыстоўвалі як расходныя матэрыялы».

Па факце спробы ўчынення акта тэрарызму следчым упраўленнем КДБ узбуджана крымінальная справа па арт. 289 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Затрымана больш за 20 асоб, у тым ліку непасрэдны выканаўца — агент украінскай спецслужбы. «Цяпер Камітэтам дзяржаўнай бяспекі ва ўзаемадзеянні з іншымі зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі праводзяцца маштабныя мерапрыемствы, накіраваныя на адпрацоўку асоб з дэструктыўнага асяроддзя на прадмет прыналежнасці іх да проціпраўнай дзейнасці, — дадаў Канстанцін Бычак. — Затрыманы Швец актыўна супрацоўнічае са следствам і дае паказанні прызнання».

МЕСЦА, ДЗЕ ЖЫВУЦЬ КВЕТКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тут, у цяпліцах, любая жанчына адчувае сябе, як у вядомай песні «Мільён пунсовых руж», толькі акрамя пунсовых сорту «Прэстыж», на духмяных плантацыях «жывуць» руковыя, жоўтыя, крэмавыя. Адзін з самых захапляльных сартоў, які адрозніваецца салодкім пахам і трохкаляровым адценнем, — чайна-гібрыдная «Міс Пігі». Побач распускаюць свае бутоны любімыя ружы дырэктара прадпрыемства сорту «Джаміля» — светла-руковыя з яркім малінавым краем.

Ружа — гэта дзяўчына, таму, як і любой прадстаўніцы прыгожага полу, ёй характэрны дзявочыя капрызы. Адна патрабуе «папіць» сярэдне, другая — больш, таму кожны з дзевяці сартоў даглядае свой кветкавод. «У раслін ёсць душа і пачуцці — гэта факт. Яны помняць рукі сваёй гаспадыні, яе голас і энергетыку, таму нашы кветкаводы — людзі, якія працуюць на прадпрыемстве вельмі даўно», — расказвае намеснік дырэктара Валянціна Шэндзюкова. Адны з тых, у каго ДУ «Віцебскі зелянбуд» з'яўляецца адзіным запісам у працоўнай кніжцы, — сёстры Людміла Кавалеўская і Вольга Крылова. Вольга Іванаўна прыйшла ў цяпліцы ў далёкім 1982 годзе, сёння яна займае пасаду майстра вытворчага ўчастка. Па прыкладзе старэйшай сястры захапілася кветкамі і Людміла Іванаўна, услед за Вольгай у 1990 годзе прыйшла ў цяпліцы вучаніцай

Кветкавод Людміла КАВАЛЕЎСКАЯ.

і ўжо на працягу 33 гадоў нястомна ахінае клопатам сваіх каляровых «падапечных».

Дзень у майстра вытворчага ўчастка пачынаецца са складання раскладу: неабходна замераць вільготнасць, праверыць дрэнаж, тэмпературу ў цяпліцы, падкарміць. Зрэз кветак праводзяць тры разы на тыдзень, у перадсвяточныя дні — часцей. Пры высокай ураджайнасці кветкаводы за адзін раз могуць сабраць да 8 тысяч бутонаў, перыяд абнаўлення руж летам — чатыры тыдні, зімой тэрмін павялічваецца да шасці-сямі. Па словах Вольгі Крыловай, віцебскія ружы адрозніваюцца не толькі яркімі пахамі, але і стойкасцю — нярэдкія выпадкі, калі калючая каралева кветак радавала пакупнікоў амаль месяц. За год з аднаго кусціка можна атрымаць каля 20 кветак, пры належным доглядзе нават састарэлыя расліны даюць ад 15 да 18 руж, а догляд за кожнай з 9 тысяч адзінак у зелянбудзе пільны, з неабходнай доляй любові. Таму, напэўна, і жанчыны-кветкаводы тут прыгожыя, бо самі падсілкоўваюцца ад руж натхненнем і пяшчотай.

Апрацоўкай і падрыхтоўкай на продаж жанчыны займаюцца самі. Трэба пачысціць сцябліну ад шыпоў і лісця, падрэзаць па вышыні і спакаваць. Пасля пярэстыя бутоны адпраўляюцца ў халадзільнік, адтуль — на прылаўкі фірменных крам «Гарадскія кветкі», якіх у горадзе на Дзвіне пяць, і ў вядомыя салоны. У гэтым годзе максімальная цана на 80-сантыметровыя ружы ў фірменных крамах Віцебскага зелянбуда — 5,50 рубля, на цюльпаны — 3,50. Штогод у гарачыя перадсвяточныя дні прадаўцы, як пчолкі, прымаюць заказы ад арганізацый і прадпрыемстваў паўночнага рэгіёна. Вось і мне 7 сакавіка прыйшлося адстаяць вялікую чаргу ў галоўнай краме прадпрыемства, каб набыць вясновыя кампліменты.

«Якія ж колеры зараз карыстаюцца попытам у пакупнікоў? Што наконт жоўтага, які здаўна лічыцца веснікам расстання?» — пытаюся я ў **намесніка дырэктара Валянціны ШЭНДЗЮКОВАЙ.** «Калі раней у гэты стэрэатып і сапраўды верылі, то сёння жоўты колер набірае папулярнасць, з'яўляецца сімвалам радасці і выццялюбства. У мінулым годзе мы ўвялі некалькі сартоў цюльпанаў з фіялетавым адценнем і атрымалі пазітыўны водгук ад пакупнікоў. Кветкі — гэта пра радасць у незалежнасці ад іх адцення».

Зараз кветкаводы вядуць актыўную падрыхтоўку да будучага сезона азеляненя горада, для гэтага сёлета падрыхтуюць каля мільёна раслін! Горад на Дзвіне заззяе новымі фарбамі ў канцы красавіка, і працягнуцца работы да самага «Славянскага базару». Дызайн-праекты кветкавых дываноў на прадпрыемстве ствараюць калектыўна, часам на адну клумбу прыходзіцца каля трох эскізаў. «Асаблівую ўвагу ўдзяляем вертыкальнаму азеляненню — упрыгожваем раздзяляльныя зоны на аўтамагістралях. Падбіраем раслінны фонд з улікам асаблівасцяў гарадскога жыцця — не ўсе кветкі змогуць прыжыцца ва ўмовах загазаванасці. У пачатку снежня пачалі сеяць холадаўстойлівыя газаніі і цынерарыі, ужо падаспеў час і для бегоній. Мы назапасілі шмат прыемных каляровых падарункаў для жыхароў горада», — расказвае Алег Сянькоў.

У Віцебскім зелянбудзе зараз працуюць каля 230 чалавек, 140 з іх — жанчыны. «А як жа вы віншуеце з Міжнародным жаночым днём сваіх кветкаводаў? Няўжо цюльпанамі і ружамі?» — задаю я галоўнае пытанне нашай сустрэчы. «А як жа нашых прыгажунь пакінуць без кветак? Прадпрыемства дорыць падарункі і нашы фірменныя вясновыя кампліменты. Паверце, што жанчыны ніколі не стамляюцца ад кветак, бо яны робяць іх асаблівымі», — усміхаецца Алег Аляксандравіч.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Па сутнасці

РАЗМОВА НА ЗАЛІК

Кажуць — выхавай, каб уладарыць. Праўдзівая філасофская думка. Наўрад ці быў час разважаць аб гэтым выказванні ў беларускіх сялян, але зямныя «навукі» бацькі «выкладалі» сваім дзецям з маленства. Таму ўжо дзецюкі накшталт Васіля Дзятліка былі дбайнымі гаспадарамі. Старэйшыя вучылі не толькі з якога боку заходзіць на ворыва, але і як адзначаць другую куццю на Каляды, што рабіць на Траецкім тыдні, вучылі паважаць старэйшых, сваю зямлю, свой род. Мне здаецца, менавіта гэта навука і зберагла нас як народ у той доўгі і цяжкі перыяд, калі мы жылі без сваёй дзяржаўнасці. Былі беззямельнымі парабкамі на сваёй жа зямлі.

А нашу моладзь — таленавітую і мэтанакіраваную — выхоўвалі. Польскія гімназіі, закрытыя пецярбургскія гурткі герцэнаўскіх рэвалюцыянераў. Мабыць, некалі і ў сівой мінушчыне непрыяцелі так папыхцелі над выхаваннем нашага «нацыянальнага цвету», што ён апаў, нібы яблыневыя кветкі падчас неспадзяванага марозу. Страцілі сваю дзяржаўнасць. На стагоддзі.

І кожная новая ўлада выхоўвала нашу моладзь супраць чагосьці альбо кагосьці. Раннія гады савецкай улады падаравалі святло адукацыі і магчымасцяў. Як кажуць, сацыяльны ліфты — для ўсіх, хто знаходзіўся ў хатах з земляной падлогай. Але неабавязкова ж было выхоўваць абразлівае стаўленне да народнай глебы — рэлігіі і традыцый. Нашу моладзь спрабавалі выхоўваць і самыя педантычныя еўрапейскія забойцы — нацысты бы скнарлівыя і ганарлівыя польскія пілсудчыкі. Нават калі мы дайшлі да Беларусі, нашу моладзь працягвалі выхоўваць чужынцы, замежныя кнігі, фільмы, заморскія норавы. Дарэчы, на што глядзелі інтэлігентныя прадстаўнікі вышэйшай улады, — якіх там было так шмат. Ці не бачылі і зразумелі, ці не заміналі? Няважна. Адказнасць за страчанае пакаленне на іх. Таму не трэба здзіўляцца, чаму дзеці, што кожную нядзелю праводзілі ў кампаніі з галівудскімі «скнарамі» і «добрымі» зладзеямі, сталі касмапалітамі і зацятымі альбо «канапнымі» мяцежнікамі.

Калі ў школах не было псіхалагінь, а былі ваенкіраўнікі, то і псіхалагічных адхіленняў не было, а хлопчыкі гулялі ў вайнушку, а дзяўчынкі — у свае гульні. Няўжо незразумела, што не тыя адукацыйныя эксперыменты паставілі над дзецьмі Беларусі. За любую трагедыю вінаватыя нясуць адказ. А хто адкажа за ментальна страчаных дзяцей? Пад кожным дакументам і праектам стаяць подпісы. Нават самае моцнае дрэва з жывым карэннем да сонца цягнецца сваімі маладымі галінкамі. А іх у нас намагаюцца абламаць.

А цяпер, дарэчы, ужо не трэба ў дзіцячыя садкі ды школы, тэхнікумы і ва ўніверсітэты ісці нібы лагодным валанцёрам з наклейкамі «юсаід» ды хітрымі ўсмешкамі і цёмнымі мэтамі. Цяпер метад маніпулявання ў кожнага ў кішэні. І адмовіцца ад уздзеяння еўрапейскімі праграмамі стала магчыма адразу пасля правалу «мяцежнага бліц-крыга». А дзе ўсе мы былі да гэтага? Нарэшце прачнуліся. Не спяць і ворагі нашай будучыні. Вядуць размову з моладдзю. Праз тэхналогіі маніпулявання. Адказ можа быць толькі адзін — весці праўдзівы дыялог з моладдзю, са студэнцтвам. Гэта самая актыўная, але ж яшчэ і часцей за ўсё імпульсіўная частка грамадства. То ж гэта вясна жыцця. Усё бурліць.

Калі «Белая Русь» пачала такія адкрытыя дыялогі, я шмат якім чыноўнікам таксама казаў: патрэбны маштабны дыялог — пошукі паразумення. Як у «рэжыме праўды»: да кожнага сэрца дайшлі, кожны фэйк разбілі. Канстытуцыйныя перамены прайшлі як свята. І пакуль чыноўнікі чухалі патыліцы, Першы даў параду. Наладзіць размову з усёй моладдзю краіны. Адміністрацыя Прэзідэнта ўсё як мае быць арганізавала і нават у самой назве дастукалася да сэрцаў моладзі — «Заліковая размова». Прычым залік ставіць сама аўдыторыя.

Пра што размаўляць з моладдзю — вядома. Пра жыццё і будучыню. На мове паразумення і праўды. Таму ў аўдыторыі перш за ўсё запрашаюць тых, у каго ёсць пытанні. І першая перамога — на сустрэчы прыходзяць з розных навучальных устаноў. Асабіста магу сведчыць: у педагагічную альма-матар прыйшлі сталічныя школьнікі. Адкуль даведаліся? З сацсетак. Значыць, мы і там можам працаваць.

Асаблівасць заліковага дыялогу — сярод спікераў, рытараў — прадстаўнікі вертыкалі. Людзі, якія кіруюць краінай. Учора ў медыйнай прасторы, сёння — ва аўдыторыі. Блізка — ва ўсіх аднасінах. А чалавечнасці ў нашых упраўленцаў не менш, чым паўнамоцтваў. Таму дыялог адразу атрымліваецца. Для цяперашняй прагматычнай моладзі яшчэ цікавыя і гісторыі поспеху. І вельмі яскравая акалічнасць, дзе яшчэ і ў якой краіне топ-кіраўнікі так проста ідуць у моладзь.

У дапамогу — медыяспікеры, вядомыя маладзёжныя блогеры. Канешне, за плячыма ў іх няма столькі ж падпісчыкаў, як ва Улада Бумагі. Замест гэтага — цікавыя і праўдзівыя веды. Ды і пераходны ўзрост скончыцца, а жыць і ствараць будучыню краіны будзе патрэбна і надалей. І менавіта тым, з кім зараз вядуць той адмысловы дыялог, бо ўжо з некалькіх крыніц пачалася вайна за сэрца і інтэлект беларускай моладзі. А моладзь, як вядома, заўжды на маршы. У хуткім часе электаральныя кампаніі пакажуць, ці атрымалася размова заліковай.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Рэкордная колькасць французаў выйшлі на акцыю пратэсту супраць пенсіённай рэформы

Каля 1,28 мільёна чалавек прынялі днямі ўдзел у масавым пратэсце, паведаміла МУС краіны. Гэта быў шосты дзень пратэстаў нязгодных з павелічэннем пенсіённага ўзросту з 62 да 64 гадоў. З такой ацэнкай не пагадзіліся прафсаюзы. Найбуйнейшае аб'яднанне Усеагульная канфедэрацыя працы (CGT) лічыць, што днямі на вуліцы французскіх гарадоў выйшлі 3,5 млн пратэстоўцаў. Апошнія маніфестацыі суправаджаліся забастоўкамі ў розных сектарах эканомікі краіны. Прафсаюзы ўжо раней абяцалі цыкл «страйкаў, што паўтараюцца» для аказання ціску на ўрад, які вылучыў праект пенсіённай рэформы. Падчас сёлетніх акцый яны абвясцілі, што наступнымі днямі пратэстаў стануць 11 і 15 сакавіка.

Пры выбуху ў сталіцы Бангладэш загінулі не менш чым 16 чалавек

Не менш чым 16 чалавек загінулі і звыш 140 пацярпелі ў выніку выбуху ў сталіцы Бангладэш Дацы, паведаміла мясцовае выданне The Daily Star. Паводле яго звестак, выбух адбыўся ў раёне Гулістана. На месца здарэння прыбылі 11 пажарных падраздзяленняў. Ад выбуху пацярпелі пяцівавярховы жылы будынак і сямівавярховы будынак рынку побач з ім. Пацярпелых даставілі ў найбліжэйшую бальніцу. У сталічнай паліцыі заявілі, што, верагодна, выбух у Гулістане — няшчасны выпадак. The Daily Star нагадала, што інцыдэнт у Дацы адбыўся праз некалькі дзён пасля выбуху на фабрыцы па вытворчасці кіслародных балонаў у Чытагонгу.

Ледзяное кольца вакол Антарктыды паменшылася да рэкорднага ўзроўню

Плошча ледзянога покрыва вакол Антарктыды скарацілася да 1,79 мільёна кв. км — мінімальнага значэння за 44 гады спадарожнікавых назіранняў, паведаміла The Guardian. Гэта трэці антырэкорд з 25 лютага мінулага года, калі льды, якія акружаюць самы паўднёвы кантынент, займалі 1,92 мільёна кв. км. Сёлета 15 лютага ледзяное кольца растала да 1,91 мільёна кв. км, а да 25 лютага паменшылася да 1,79 мільёна кв. км. «Мы бачым менш лёду паўсюль. Гэта цыркумпалярная падзея», — прыводзіць The Guardian словы эксперта па антарктычным марскім лёдзе з Універсітэта Тасманіі Уіла Хобса. Асаблівыя апасенні выклікае ледавік Туэйтса ў моры Амундсена, вядомы як «ледавік суднага дня» — у ім утрымліваецца столькі вады, што пры яго раставанні сусветны акіян можа падняцца на паўметра.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

НЕЖАЛЕЗНЫ ЧАЛАВЕК

Як распазнаць у сябе анемію?

Упадак сіл, дэпрэсія, бледнасць, выпадзенне валасоў і сухасць скуры, сэрцабіцце або задышка, санлівасць і раздражняльнасць — частыя прыкметы недахопу жалеза ў арганізме. Жалеза неабходна для нармальнай дзейнасці імунnай сістэмы арганізма. Таму, калі чалавек пакутуе на анемію, ён часта хварэе, адчувае слабасць, хранічныя стрэсы. Як распазнаць сапраўдную анемію і папоўніць дэфіцыт гэтага мікраэлемента?

У ЧЫМ РОЛЯ ГЕМАГЛАБІНУ?

Ужо на пачатковым этапе абследавання ў паліклініцы пацыента накіроўваюць у клініка-дыягнастычную лабараторыю на агульны аналіз крыві. Кроў разглядаюць як галоўную пазаклеткавую вадкасць арганізма. У ёй, падобна кропелькам тлушчу ў малацэ, знаходзяцца так званыя форменныя элементы — эрытрацыты, лейкацыты, трамбацыты, «якія плаваюць» у вадкай частцы крыві — плазме.

Самымі шматлікімі насельнікамі крыві з'яўляюцца эрытрацыты. Кожны з іх мае жаўтлява-чырвоную афарбоўку, але калі іх мільёны, то пераважным становіцца чырвоны колер (слова «эрытрацыт» паходзіць са спалучэння двух грэчаскіх слоў: «эрытрос» — чырвоны і «цытас» — клетка). Рэчывам, якое афарбоўвае эрытрацыты, з'яўляецца пігмент гемаглабін.

— Гемаглабін — асноўны дыхальны пігмент эрытрацытаў, які адносіцца да хромапратэідаў і забяспечвае тканкі кіслародам. Ён складаецца з бялку — глабіну і гема — злучэння протапарфірыну з жалезам. Апошні надае гемаглабіну характэрную афарбоўку, — расказвае **загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.** — Для гемаглабіну характэрна здольнасць звязвацца з кіслародам паветра. Пры гэтым гемаглабін крыві паглынае прыкладна ў 60 разоў большую колькасць кіслароду, чым фізічна можа быць растворана ў плазме пры тэмпературы жывога арганізма.

У адным кубічным міліметры крыві здаровага мужчыны ўтрымліваецца каля 4—5,5 млн эрытрацытаў, жанчыны — 3,9—4,7 млн. Калі распластаць усе наяўныя ў сасудзістым рэчышчы эрытрацыты, размясціўшы іх адзін каля аднаго, то ўтвораная імі плошча апынецца ў 1500—2000 разоў большая за паверхню чалавечага цела. Гэта дазваляе гемаглабіну эрытрацытаў вельмі хутка насычацца кіслародам і аддаваць яго тканкам.

Аднак роля гемаглабіну не абмяжоўваецца ўдзелам у транспарце кіслароду. Ён вельмі актыўна вызваляе тканкі ад лішку вуглякіслага газу, які ўтвараецца падчас абмену рэчываў, спрыяючы выводу з арганізма да 90 % вуглекіслаты. Гемаглабін здольны ўступаць у сувязь з вокісам вугляроду з утварэннем карбаксігемаглабіну, што робіць арганізм вельмі адчувальным да ўгарнага газу (бо ў ім утрымліваецца вялікая колькасць вокісу вугляроду) і прыводзіць да кіслароднага галадання.

ЧАМУ ЁН ПАВЫШАЕЦЦА?

Да павелічэння канцэнтрацыі гемаглабіну ў крыві прыводзяць некаторыя захворванні крыві, звязаныя з узмоцненай прадукцыяй эрытрацытаў касцяным мозгам (эрытрэмія).

Аднак варта мець на ўвазе, што павелічэнне канцэнтрацыі гемаглабіну ў крыві назіраецца ў людзей не толькі хворых, але і ў здаровых, якія пражываюць ва ўмовах нізкага ўзроўню кісларoду ў паветры (напрыклад, у высакагорных раёнах), што прыводзіць да кампенсаторнага ўзмацнення прадукцыі эрытрацытаў. Таксама павышэнне гемаглабіну можа быць выклікана моцным паценнем і згушчэннем крыві (напрыклад, пры работе ў гарачых цэхах), пры ванітах (у цяжарных) або прафузным паносе (напрыклад, у дзяцей), пры апёках. Фізіялагічнае павелічэнне ўтрымання гемаглабіну ўласціва нованароджаным. Такім чынам, не толькі захворванні могуць выклікаць змены канцэнтрацыі гемаглабіну ў крыві.

ЯКІ ГЕМАГЛАБІН ЛІЧЫЦЦА ПАНІЖАНЫМ?

А вось зніжэнне ўзроўню гемаглабіну з'яўляецца асноўным лабараторным сімптомам анеміі. Пры гэтым яго канцэнтрацыя вар'іруе ў шырокіх межах у залежнасці ад формы анеміі і яе ступені. Так, пры найбольш частай форме малакроўя ў большасці хворых адзначаецца адносна ўмеранае зніжэнне гемаглабіну — да 85—114 г/л, а больш выяўленае памяншэнне — 60—84 г/л — назіраецца радзей.

Варта, аднак, мець на ўвазе, што дыягностыка анеміі ні ў якай меры не можа быць праведзена толькі на падставе вызначэння канцэнтрацыі гемаглабіну ў крыві.

— Гэта даследаванне ўстанаўлівае толькі факт яе наяўнасці і павінна пацягнуць за сабой больш глыбокае і поўнае абследаванне. Анеміі розныя па этыялогіі, механізмах развіцця, клініка-гематалагічнай карціне. Прычыны развіцця анемій розныя, але пры ўсіх відах анемій у хворых развіваецца гіпаксія ў выніку зніжэння ўзроўню гемаглабіну. Анемія можа быць як самастойным захворваннем, так і спадарожным сімптомам ці ўскладненнем некаторых унутраных хвароб, — тлумачыць урач.

Прыкметы нізкага гемаглабіну — галавакружэнне, страта прытомнасці, зніжэнне апетыту, шум у вушах, частыя галаўныя болі, задышка, тахікардыя, млявасць, пастаянная стомленасць.

ЯК ЗМАГАЦЦА З МАЛАКРОЎЕМ?

Сродкі, якія павышаюць гемаглабін у крыві, — найперш прадукты, багатыя на жалеза. Пры паніжаным гемаглабіне рэкамендуюць есці мяса. Гэта можа быць нятлустая цяляціна, свініна, ялавічына. Добра павялічваецца гемаглабін ад ялавічнай печані, пажадана не моцна яе прасмажваць.

— Абавязкова ўжывайце ў ежу гародніну і садавіну, якія змяшчаюць вітамін С, які дапамагае нам у засвойванні жалеза. Гэта апельсіны, лімоны, грэйпфруты, ківі, гранат, але не трэба есці іх кілаграмамі. Дастаткова аднаго апельсіна, палавінкі грэйпфрута, чвэрці граната ў дзень, — рэкамендуе Людміла Кіпцэвіч. — З гародніны і садавіны нашым арганізмам засвойваецца прыкладна 5 % жалеза. Акрамя таго, ешце супы, не забывайце пра крупы і чорны хлеб, дадавайце ў салаты больш кропу і пятрушкі. З круп карысныя грэчка, фасоля, талакно, сачавіца, гарох. З гародніны — морква, буракі, бульба, асабліва печаная разам з лупінай.

Персікі, абрыкосы, маліна, клубніцы, журавіны, слівы, чорная парэчка, хурма, кізіл, фейхоа, суніцы і чарніцы таксама спрыяюць засваенню жалеза. У сезон клубніц і суніц імкніцеся есці як мага больш гэтых ягад. Карысныя рыба, чырвоная ікра, яечны жаўток, малочныя прадукты і морапрадукты. З рыбы, морапрадуктаў, яйкаў засвойваецца прыкладна 12 % жалеза.

Гемаглабін можна аднавіць за тыдзень. Акрамя правільнага харчавання, гэтаму дапаможа настой з пладоў шыпшыны. Паўтары лыжкі сухіх пладоў трэба растаўчы і заліць шклянкай кіпеню (250 грамаў) у тэрмасе на ноч, а раніцай працадзіць настой і дадаць у яго чайную лыжку натуральнага мёду і сталовую лыжку соку цытрыны. Гэты напой карысны і дарослым, і дзецям. Дарослыя павінны выпіваць па шклянцы раніцай перад сняданкам, а дзеці мусяць прымаць па палове шклянкі ў дзень.

ФУФЛАМІЦЫНЫ Ў НОС: ЯКІЯ КРОПЛІ БЕСКАРЫСНЫЯ І НЕБЯСПЕЧНЫЯ

Кроплі ад насмарку са срэбрам — аптэчны шлягер прастуднага сезона і ў нас, і ў іншых краінах. Блогеры і зоркі шоу-бізнесу з ЗША цешацца, што ніколі яшчэ лячэнне такой неэстэтычнай хваробы, як насмарк, не было такім элітным. А галоўнае — ніякай медыцынскай хіміі.

Зарэгістравана дастаткова шмат гандлёвых марак ад розных кампаній, і практычна ўсе яны змяшчаюць двухпрацэнтны раствор срэбра. Гэта — сродкі ад насмарку, і амаль усе яны — адзін і той жа фармацэўтычны кактэйль, вядомы пад назвай пратаргол з кроплямі раствора срэбра, жывёльнага бялку, які не дае срэбру зліпнуцца, і жэлаціну. Яго актыўна рэкамендуюць аптэкары і раяць народныя лекары.

Аднак ці такі бясшкодны гэты прэпарат? Срэбра — гэта не толькі каштоўны, але і цяжкі метал другога класа небяспекі. Пры гэтым не існуе такога паняцця, як дэфіцыт срэбра, тлумачаць урачы, бо арганізму гэтае рэчыва не патрэбна наогул. Яно не ўдзельнічае ні ў якіх фізіялагічных працэсах. Пры гэтым, як і ўсе цяжкія металы, срэбра назапашваецца ў органах, у тым ліку і ў скуры.

Шкода срэбра перавешвае яго бактэрыцыдныя ўласцівасці, а менавіта таму лекі на яго аснове забаранілі Мінздароўя ЗША і Аўстраліі. У любых формах і відах. Да таго ж ацёк носа ў 90 % выпадкаў выклікаюць вірусы, а супраць іх срэбра бяззбройнае. Яно здольна пашкодзіць толькі клеткавыя мембраны бактэрый.

Іншы аптэчны хіт, які разлятаецца з вітрын у сезон грыпу, — сасудазвужальныя кроплі і спрэі. Такія лекі здольныя прабіць нават самы цяжкі насмарк. Калі ў арганізм трапляюць вірусы ці бактэрыі, імунная сістэма ў адказ пачынае ўзмоцнена выпрацоўваць лімфацыты — клеткі крыві, якія адпраўляюцца душыць заразу. А каб як мага хутчэй даставіць гэты спецназ, напрыклад, у нос, арганізм пашырае магістралі для праезду — гэта значыць сасуды, сеткай з якіх тая ж слізістая носа літаральна ўсыпаная. З-за гэтага нос і ацякае. Паветраныя каналы становяцца вузкімі, дыхаць становіцца цяжэй.

Аблегчыць дыханне могуць прэпараты, якія ўмеюць сасуды назад звужаць. Адмысловыя стымулятары ў іх складзе дзейнічаюць на рэцэптары слізістай, і тыя сілком прымушаюць сасуд скарачацца. Ацёк спадае, і пакуль лекі дзейнічаюць, дыхаецца лёгка. Трэба толькі не забывацца, што імунныя механізмы ад гэтага не адключаюцца. Таму ў інструкцыі да такіх прэпаратаў паказана, што выкарыстоўваць іх можна пару разоў у суткі, не больш.

Калі рабіць гэта часцей, то ў слізістай утвараюцца новыя сасуды, і ўсе яны навучацца пашырацца мацней, чым звычайна, і дыхаць без прэпарата стане яшчэ складаней. Так з'яўляецца залежнасць: без кропель ужо не ўдыхнуць, нават калі вірусы ці бактэрыі пераможаны.

Аднак ёсць у такіх кропель пабочка і больш страшная. Самы вядомы сродак — нафтызін з дзейным рэчывам нафазалін, якое паважаюць за эфектыўнасць і таннасць, аказваецца, смяротна небяспечны. Пра гэта мала хто ведае, але нафтызін, асабліва калі яго капнуць крыху больш, з лёгкасцю пераадольвае так званы гематаэнцэфалітычны бар'ер — гэта своеасаблівы «вартаўнік» арганізма, які не дае пракрасціся ў мозг небяспечным рэчывам з крыві. Менавіта таму ў ЗША такія кроплі спачатку забаранілі даваць дзецям да 12 год, а потым і дарослым.

Пюрэ хуткага прыгатавання: шкода для страўніка ці нядрэнны перакус?

Многія перакананы, што сублімаваная бульба — гэта не бульбачка зусім, а нейкі сінтэтычны клейстар для тых, каму не шкада страўніка. Хоць, наогул, сухое бульбяное пюрэ — нашчадак старадаўняга перуанскага паўфабрыката пад назвай чуньо. Бульбу вымаражвалі на холадзе, потым пакідалі на сонцы, каб расставала, губляла ваду, і сушылі. І гэта іх нацыянальны далікатэс. Можа быць, сублімаваную бульбу дарма дэманізуюць? Колькі клубняў змяшчаецца ў адну ўпакоўку? І што з імі насамрэч вытвараюць у цэхах?

Вытворчасць бульбянога пюрэ пачынаецца з бульбасховішча. Выкарыстоўваюць бульбу пэўнага сорту — «Гала». Пюрэ з яго атрымліваецца больш насычаным па смаку і патрэбнай кансістэнцыі.

На заводзе бульбачка аддзяляецца ад зямлі і па лініі адпраўляецца на мыйку ў адмысловы барабан. Прынцып працы — як у пральнай машыне, але ніякія мыйныя сродкі не выкарыстоўваюцца. Гэта і не трэба, усе бактэрыі загінуць крыху пазней — падчас варэння.

Пасля гэтага бульба скідаецца ў гіганцкую параварку. Лупіна разрываецца ад тэмпературы ў 90 градусаў і ціску ў 16 бар. Так, на заводзе не сустрэнеш людзей, якія абіраюць гэтую гародніну на хуткасць штодня. Усё гэта робяць машыны. Таму пасля адпарвання бульбачка паступае ў адмысловы апарат, тут яна лёгка ачышчаецца шчоткамі.

А вось сартуюць бульбу людзі. Пасля чаго яна паступае ў трубу, дзе рухаецца з хуткасцю 250 км/г і ўразаецца ў вострыя нажы. У выніку атрымліваюцца бульбяныя шайбы.

Для таго каб атрымаць пюрэ, бульбу трэба даварыць. Гэта робяць у варачніку, а пасля ў масу дадаюць эмульгатары, каб пюрэ было больш клейкім па кансістэнцыі, і адпраўляюць яго на гарачыя качалкі. Тэмпература — 200 градусаў.

У выніку атрымліваецца «бульбяны пергамент». Таўшчыня лістоў усяго два міліметры. І засталося толькі зрабіць з гэтага парашок.

Бульбяныя шматкі самі па сабе досыць прэсныя. Таму іх запраўляюць рознымі смакавымі дабаўкамі. Напрыклад, грыбы, грэнкі, смятана і зеляніна, сухое малако і мяса — курыца і ялавічына.

Перад тым як адправіць на прылавак, кожную партыю сухой бульбы правяраюць у лабараторыі.

Шкляначкі з бульбай гатовыя. У адной — 180 калорый. Сытным абедам гэта, вядома, не назавеш, але ў якасці вымушанага перакусу — вельмі нават нядрэнна. І склад не такі дрэнны, як здаецца. Адна шкляначка складаецца на 90 % з бульбы.

Тэма для размовы

Коласаўскі падыход

На што павінна арыентавацца сучаснае дзіцячае кнігавыданне

У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшоў круглы стол «Музей і школа: магчымасці сістэматызаванага сумеснага падыходу да вывучэння творчасці і асобы класіка»; «Персанальная энцыклапедыя «Якуб Колас»; «Узровень цэн на кніжную прадукцыю як фактар даступнасці»; «Месца прыватных выдаўцоў на рынку кніжнай прадукцыі»; «Сацыяльная адказнасць выдаўцоў»; «Літаратурныя музеі для дзяцей: правакацыя чытаць». Мадэратарам размовы па ўсіх гэтых актуальных кірунках выступіў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

Грунтоўным паведамленнем на тэму «Сумесная дзейнасць дзіцячых бібліятэк і школ па патрыятычным выхаванні праз любоў да кнігі і роднай мовы» распачала размову на круглым стале **супрацоўнік Мінскай гарадской цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Карына МАЦКО.** Сапраўды, у сістэме дзіцячых бібліятэк сталіцы робіцца неверагодна шмат для прапаганды айчыннай кнігі. Юныя чытачы і іх бацькі прыходзяць у асветніцкія ўстановы не проста дзеля таго, каб узяць з паліцы тую ці іншую кнігу. Прыходзяць па параду, досвед, для ўдзелу ў рознага характару прэзентацыях, знаёмства з кніжнымі навінкамі. Летась, у прыватнасці, неверагодна шмат было зроблена бібліятэкарамі дзеля ўшанавання нашых класікаў — народных песняроў Беларусі Якуба Коласа і Янкі Купалы ў сувязі са 140-годдзем з дня іх нараджэння. І памагатым у гэтай працы быў, канешне ж, Коласаўскі музей. У многіх мерапрыемствах удзельнічалі нашчадкі класіка — **унучкі паэта Марыя МІЦКЕВІЧ, Вера МІЦКЕВІЧ, праўнучка кандыдат сацыялагічных навук Васіліна МІЦКЕВІЧ.** Імі вельмі шмат зроблена і для прэзентацыі кнігі, прысвечанай жонцы Якуба Коласа — «Табой я жыў, табой жыву...» Унікальнае выданне, якое пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда», стала падзеяй і ў беларускім літаратуразнаўстве, і ў беларускай культуры.

Гаварылі на круглым стале і пра тое, што не стае папулярных кніг пра Якуба Коласа, адрасаваных юнаму чытачу, як і не стае кніг самога класіка, выдадзеных з разлікам на прачытанне дзецьмі, на працу з гэтай кнігай настаўнікамі пачатковай школы, на працу бібліятэкараў з зусім юнымі чытачамі. Такіх кніг павінна быць многа. І нядзіўна, што ў апошнія літаральна два гады кніжачка «Беларускія народныя казкі ў апрацоўцы Якуба Коласа» пабачыла свет трыма накладамі. Выдадзеная ў Выдавецкім доме «Звязда», яна разыходзілася ў кожным з тыражоў імгненна, за некалькі месяцаў. У Якуба Коласа вельмі шмат твораў, адрасаваных самым юным чытачам. І найцікавейшы з іх — паэма «Міхасёвы прыгоды». Два гады назад адно прыватнае выдавецтва выпусціла гэтую кнігу ў свет зусім невялікім накладам. Раней, у 1994 годзе, кніга пабачыла свет тыражом 20 000 экзэмпляраў, дзякуючы выдавецтву «Юнацтва»... А што сёння?.. Хіба ў XXI стагоддзі «Міхасёвы прыгоды» не будуць запатрабаваны?!. І як перакананць айчынныя выдавецтвы ў тым, што такія кнігі павінны выдавацца масавым тыражом?!. Чаму б, напрыклад, і не з новым афармленнем маладых кніжных графікаў. Шукаючы новыя тэматычныя абсягі, мастакі часам забываюцца на роднае і блізкае, на тое, што фарміруе нашу краіну, нашу Беларусь...

Вядомы ў краіне музейшчык, багданавічанаўца, паэт і перакладчык Міхал БАРАНОЎСКІ нагадаў пра тое, што ў шэрагу персанальных энцыклапедый «Янка Купала» (а пачатак быў пакладзены ў 1986 годзе; Беларусь была адным з лідараў у стварэнні персанальных энцыклапедый. Купалу прысвечана і трохтомная персанальная энцыклапедыя), «Скарына», «Максім Багдановіч», «Уладзімір Караткевіч». Вядома, што ў свой час у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» склалі слоўнік з некалькіх тысяч тэм для будучай персанальнай энцыклапедыі. Вядома, што па многіх тэмах былі раздадзены заданні дасведчаным аўтарам, найперш — коласазнаўцам. Але няма ўжо энцыклапедычнага выдавецтва: частка яго калектыву ўлілася ў выдавецтва «Беларусь». Зразумела, праект такога масштабу, як шматтомная персанальная энцыклапедыя, можа з'явіцца толькі як супольная работа розных дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў. Але такое выданне павінна прыйсці да айчыннага чытача, павінна прыйсці ў бібліятэкі. Сам факт яго нараджэння можа істотным чынам паспрыяць развіццю коласазнаўства на новым узроўні. Міхал Бараноўскі нагадаў пра тое, што ў свой час асобныя артыкулы будучай коласаўскай энцыклапедыі друкаваліся ў часопісе «Роднае слова». І зараз можна было б раздзяліць працу па падрыхтоўцы персанальнай энцыклапедыі на некалькі этапаў. І першым з іх павінен стаць напісанне і адпаведна саміх артыкулаў, прысвечаных Коласу, яго творам, перакладчыкам вершаў, паэм, апавяданняў, аповесцяў на розныя мовы народаў свету, прысвечаных мясцінам, якія наведваў народны пясняр... Хто толькі возьме на сябе кансалідацыю гэтых намаганняў?..

Бібліятэкары, нагадаўшы пра выданні, накшталт тых, што пабачылі свет у серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» (выдавецтва «Мастацкая літаратура»), гаварылі пра тое, што патрэбны лаканічныя папулярныя кнігі пра Якуба Коласа і Янку Купалу. Так што ёсць і такі сацыяльны заказ ад бібліятэкараў, якія ўсвядомлена, зыходзячы з чытацкіх інтарэсаў, падыходзяць да праектавання ідэй, розных кніжных задум. Пра вартасці шырокай прапаганды айчыннай класікі, яе ўплываў на развіццё, пашырэнне чытацкіх актыўнасцяў гаварылі на круглым стале дырэктар цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк горада Мінска Таццяна ШВЕД, яе калегі з розных дзіцячых бібліятэк і бібліятэк адукацыйных устаноў Мінска.

Прыкметным быў удзел у круглым стале і вядомага мастака — карыкатурыста і кніжнага графіка і не меней вядомага выдаўца Анатоля ГАРМАЗЫ. Ён звярнуў увагу на высокі кошт кнігі, на тое, што большай увагі патрабуе кніга на беларускай мове. Асабліва — тая беларускамоўная кніга, якая адрасавана дзецям. Сваімі развагамі пра супольную працу музейшчыкаў і кнігавыдаўцоў падзялілася і **дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна ГАЛІНОЎСКАЯ.**

Гаспадыня коласаўскай музейнай пляцоўкі — дырэктар музея Ірына МАЦЯС адзначыла вартасці і размовы на розныя тэмы, што спрыяе развіццю ўвагі да жыцця і творчасці Якуба Коласа. А таксама нагадала пра тое, што фестываль дзіцячай кнігі «Ідзі, зіма, ідзі ў дарогу!» атрымае сваё развіццё. І наступным праектам падобнага характару стане фестываль дзіцячай кнігі ў Коласаўскім музеі «Міхасёвы прыгоды». Ужо вызначана і дата яго правядзення — 2 чэрвеня. Дарэчы, фестываль «Міхасёвы прыгоды» праводзіцца другі год запар. У 2022-м былі яго вытокі... І сярод заснавальнікаў фестывалю па-ранейшаму і сёлета будзе Саюз пісьменнікаў Беларусі. «Мы шукаем самыя розныя формы супольнай працы, — падзялілася развагамі Ірына Мацяс. — Лічым, што музей можа аб'яднаць усіх, хто ў нашым грамадстве з пашанай ставіцца да беларускага прыгожага пісьменства, да спадчыны класікаў, хто бачыць у звароце да жыцця і творчасці Якуба Коласа велізарны патэнцыял у выхаванні патрыятызму, любові да Радзімы».

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Спецыяльны рэпартаж

НА СПАТКАННІ З БРАЗІЛІЯЙ

Карэспандэнты «Звязды» адкрылі экзатычную краіну

Пасольства Бразіліі зноў здзіўляе. Тым, хто адчайна шукае вясну ў сакавіцкіх сумётах, варта завітаць у сталічны Палац мастацтваў. Тут адкрылася незвычайная выстава «Спатканне з Бразіліяй». Ініцыятар — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Бразіліі ў Беларусі Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл. Паўгода таму ён узначаліў дыпламатычную місію і за гэты час арганізаваў шэраг крэатыўных праектаў. Тут былі чароўная бразільская музыка, гарачы футбол, духмяная кава. А цяпер Бразілію можна пабачыць на свае вочы. Дакладней, вачыма 16 беларускіх мастакоў.

— Гэтая падзея нарадзілася з вялікага жадання наблізіць бразільскую і беларускую культуры, — прызнаўся карэспандэнту «Звязды» Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл. — Я ўбачыў, з якім пазітывам у Беларусі ставяцца да Бразіліі. І вельмі захацелася ўвасобіць гэты погляд, каб пабачыць, што ў выніку атрымаецца і паказаць усім. Мастакі, якія ўдзельнічаюць у праекце, ніколі не былі ў Бразіліі. Але яны здолелі адлюстраваць душу далёкай краіны. Я проста ў захапленні ад выніку. Ён цудоўны як з пункту гледжання тэхнічнага выканання, так і з пункту гледжання разнастайнасці закранутых тэм. Я ганаруся тым, што магу прадставіць маім шаноўным беларускім сябрам магчымасць адчуць смак маёй краіны.

Куратар праекта «Спатканне з Бразіліяй» Надзея ХМЫЛЬ запрасіла атрымліваць задавальненне ад мастацтва і ад выяў Бразіліі.

— Наша выстава — пра аб'яднанне дзвюх краін, а таксама 16 мастакоў. Мы стварылі калектыўны партрэт Бразіліі, якім чынам можам яе ўявіць, ніколі не наведваючы, — заўважыла Надзея Хмыль. — Выстава разнапланавая, прысутнічаюць розныя віды мастацтва. Спадзяюся, у нас атрымалася распаліць у вас цікавасць да экзатычнай, далёкай, рамантычнай Бразіліі.

На выставе прадстаўлены традыцыйныя жывапіс, графіка, а таксама арт-аб'екты, інсталяцыі, лічбавае мастацтва і нават анімацыя. Тут каго толькі не адшукаеш. Нават... русалку Сэрэю. Аб'ект стварыла Настасся Акулава. Яе зацікавілі міфы і казкі Бразіліі. Так і «нарадзілася» русалка.

У Вікторыі Богуш — іншая тэма. Яна імкнецца, каб мы прасякнуліся чыстымі формамі, якія сабраныя з архітэктурных формаў геніяльнага Оскара Німеера. «Мяне не прывабліваюць ні прамы вугал, ні прамая, жорсткая лінія, якая не гнецца. Мяне прыцягвае лінія, якая свабодна выгнутая, пачуццёвая лінія. Тая, якая нагадвае мне горы маёй краіны, мудрагелістыя выгіны рэк, высокія аблокі, цела каханай жанчыны», — сказаў некалі Оскар Німеер.

Графічная серыя Паўла Булвы пераклікаецца з рамана Жуана Гімарайнса Розы. Гэта своеасаблівая філасофская рэфлексія аб сучасным і гістарычным кантэксце далёкай Бразіліі. А ў Надзеі Хмыль жанчына на пляжы літаральна рассыпаецца на пікселі. Гэта пра стэрэатыпы, з якіх многія з нас падсілкоўваюць уяўленне пра экзатычную краіну.

Так што абавязкова завітайце на спатканне з Бразіліяй. На пляцоўцы выставы адбудуцца прэзентацыі самбы, капаэйры, батукады, бразільскай паэзіі, дэгустацыя кавы, разнастайныя тэматычныя майстар-класы.

— Галоўная мэта — збліжэнне бразільскага і беларускага народаў — дасягнута, — лічыць Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл. — Пасля Мінска, магчыма, правязём выставу па ўсёй Беларусі.

Гэта насамрэч варта пабачыць. І сустрэць вясну разам з гарачай Бразіліяй. Сакавік — час рамантычных спатканняў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении четвертых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699, г. Минск, ул. Мельникайте, д. 2, оф. 2001 (помещение 1)), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

Дата и время проведения торгов: **24 марта 2023 года**. Начало – 12.00. Заявки принимаются с 09 марта 2023 года по 22 марта 2023 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайтах http://bankrot.gov.by/ и http://www.specrealization.by/. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) – +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 184 (29806) за 20.09.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 221 (29843) за 10.11.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 257 (29879) за 30.12.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 15 (29895) за 25.01.2023.

Абітурыент-2023

АСАБІСТЫЯ І МАРАЛЬНЫЯ ЯКАСЦІ

Міністэрства адукацыі ўстанавіла форму характарыстыкі выпускніка

У гэтым годзе такі дакумент павінны будуць падаць у прыёмную камісію ВНУ ўсе выпускнікі школ і навучэнцы каледжаў, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную або сярэднюю спецыяльную адукацыю.

У характарыстыцы будуць адлюстроўвацца асабістыя і маральныя якасці абітурыента: яго выканаўчасць, дысцыплінаванасць, ініцыятыўнасць, ступень самастойнасці, сфарміраванасць у маладога чалавека навыкаў здаровага ладу жыцця, актыўнасць, інтарэсы, лідарскія якасці, адказнасць, прыстойнасць, тактоўнасць, добразычлівасць, спагадлівасць, стаўленне да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў і г. д.

Таксама ў характарыстыцы будзе згадвацца інфармацыя аб удзеле выпускніка (навучэнца) у рабоце органаў самакіравання ўстановы адукацыі, маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, арганізацыі і правядзенні грамадска значных мерапрыемстваў, акцый, шэфстве над ветэранамі вайны і працы, у спартыўных спаборніцтвах, спартыўна-масавых мерапрыемствах, выстаўках, конкурсах тэхнічнай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці, у валанцёрскім, студатрадаўскім руху. Асобным радком будзе адлюстравана інфармацыя аб дысцыплінарных спагнаннях, прыменены да выпускніка (навучэнца) на працягу апошняга года да даты выдачы характарыстыкі, аб яго паводзінах, індывідуальных дасягненнях у навучанні, удзеле ў алімпіядах і інтэлектуальных конкурсах.

Каб атрымаць характарыстыку, неабходна падаць запыт у адпаведную ўстанову адукацыі ў год паступлення. Да запыту могуць быць прыкладзены дакументы, якія ўтрымліваюць звесткі, важныя для іх адлюстравання ў характарыстыцы. Установа адукацыі павінна выдаць характарыстыку на працягу пяці каляндарных дзён з дня атрымання адпаведнага запыту.

Як абяцаюць у Міністэрстве адукацыі, на конкурсную сітуацыю характарыстыка не ўплывае. Дадатковых бонусаў яна не дае. Але гэта вельмі важная інфармацыя для ўпраўленняў выхаваўчай работы і грамадскіх арганізацый ва ўніверсітэтах. Актывістаў убачаць адразу. Ім могуць прапанаваць стаць старастамі груп, уцягнуць у работу творчых аб'яднанняў, студэнцкіх лабараторый, груп па інтарэсах, органаў студэнцкага самакіравання і гэтак далей.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699, г. Минск, ул. Мельникайте, д. 2, оф. 2001 (помещение 1)), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

Дата и время проведения торгов: **24 марта 2023 года**. Начало – 11.00. Заявки принимаются с 09 марта 2023 года по 22 марта 2023 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайтах http://bankrot.gov.by/ и http://www.specrealization.by/. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 184 (29806) за 20.09.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 257 (29879) за 30.12.2022.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 15 (29895) за 25.01.2023.

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении первых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699, г. Минск, ул. Мельникайте, д. 2, оф. 2001 (помещение 1)), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

Дата и время проведения торгов: **24 марта 2023 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 09 марта 2023 года по 22 марта 2023 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интернет-сайте http://bankrot.gov.by/» и http://www.specrealization.by/. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 221 (29843) за 10.11.2022

Папрасіў вывесці біткоіны

І застаўся без грошай

У міліцыю звярнуўся мінчанін, які займаецца здзелкамі з крыптавалютай, і расказаў, што стаў ахвярай падмануну. Вырашыўшы зрабіць наяўнымі віртуальныя грошы, ён папрасіў аб дапамозе свайго знаёмага — кліента патрэбнага банка.

Дзеля таго ён перавёў на рахунак прыяцеля «крыпту», а той павінен быў зняць беларускія рублі. Як далей разгортваліся падзеі, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама. Удвух мужчыны прыехалі да аддзялення банка, пацярпелы застаўся чакаць у машыне, а прыяцель пайшоў унутр. Зняўшы з рахунку 58 тысяч рублёў, ён змяніў вопратку (тут праваахоўнікі не паведамляюць дэталі), выйшаў праз іншыя дзверы і з'ехаў на таксі.

Сышчыкі Савецкага РУУС затрымалі 21-гадовага мінчаніна. Пры ім знайшлі частку ўкрадзеных грошай, астатняе ён выдаткаваў на забавы. Следчымі заведзена крымінальная справа. Фігуранту пагражае да 12 гадоў пазбаўлення волі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ОАО «Сантехэлектромонтаж» доводит до сведения акционеров общества, что 28.02.2023 г. годовым общим собранием акционеров по всем вопросам повестки дня решение принято. УНП 400052115

Извещение о проведении 10 апреля 2023 года аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего УП «УКС Мингорисполкома»

Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов)			
№ предмета торгов	Наименование и характеристики продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Стеклопакет размером 1377*4527 в количестве 20 штук	7 678,56	700,00
2	Стеклопакет размером 1377*4527 в количестве 20 штук	7 678,56	700,00
3	Стеклопакет размером 1377*4527 в количестве 20 штук	7 678,56	700,00
4	Стеклопакет размером 1377*4527 в количестве 20 штук	7 678,56	700,00
5	Стеклопакет размером 1377*3627 в количестве 20 штук	6 151,92	600,00
6	Стеклопакет размером 1377*3627 в количестве 20 штук	6 151,92	600,00
7	Стеклопакет размером 1377*3627 в количестве 20 штук	6 151,92	600,00
8	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
9	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
10	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
11	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
12	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
13	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
14	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
15	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
16	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
17	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
18	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
19	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
20	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
21	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
22	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
23	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
24	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
25	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
26	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
27	Стеклопакет размером 1377*2977 в количестве 30 штук	7 574,40	700,00
28	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
29	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
30	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
31	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
32	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
33	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
34	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
35	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
36	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
37	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
38	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
39	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
40	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
41	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
42	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
43	Стеклопакет размером 1377*2777 в количестве 35 штук	8 182,92	800,00
44	Стеклопакет размером 1377*2512 в количестве 35 штук	7 456,26	700,00
45	Стеклопакет размером 1377*1827 в количестве 30 штук	4 648,32	400,00
46	Стеклопакет размером 1377*1827 в количестве 30 штук	4 648,32	400,00
47	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
48	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
49	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
50	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
51	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
52	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
53	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
54	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
55	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
56	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
57	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
58	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
59	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
60	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
61	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
62	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
63	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
64	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
65	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
66	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
67	Стеклопакет размером 1377*677 в количестве 40 штук	2 296,32	200,00
68	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
69	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
70	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
71	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
72	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
73	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
74	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
75	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
76	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
77	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
78	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
79	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
80	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
81	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
82	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
83	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
84	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
85	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
86	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
87	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
88	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
89	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
90	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
91	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00
92	Профиль размером 50*110 в количестве 400 м.п.	34 248,00	3 400,00

Местонахождение продаваемого имущества: «Многофункциональный комплекс на пересечении пр. Независимости и ул. К. Туровского в г. Минске».

Продавец имущества: УП «УКС Мингорисполкома», ул. Советская, 17, 220030, г. Минск, тел.: (017) 200-70-93.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего УП «УКС Мингорисполкома», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) по соответствующему предмету торгов и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 10.04.2023 по предмету торгов №____.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по факту поставки в течение 15 календарных дней с момента отгрузки без предоставления рассрочки.

Торги проводятся **10 апреля 2023 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 13.03.2023 по 06.04.2023** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (044) 755-87-92.

Телефоны для справок: (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (044) 755-87-92 (УП «УКС Мингорисполкома»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Оборудование, транспорт, воздушные суда».

«А ЯК ЖА СТУКНУЦЬ ПА ГЭТЫХ МОРДАХ?»

Канцоўкі беларускіх твораў, перапісаныя аўтарамі

Уявіце, што «Залатое цяля» Ільфа і Пятрова заканчваецца тым, што Астап Бэндэр жэніцца з Зосяй Сініцкай — так, так, прыгажуня-камсамолка ўсё-ткі выйшла замуж за вялікага камбінатара! Чытацкая фантазія? А менавіта такі фінал і напісалі першапачаткова аўтары. Пасля зразумелі, што такі хэпі-энд не пройдзе, трэба злачынцу караць, і пакінулі яго збітым, самотным і абрабаваным. Дарэчы, і пушкінская Таццяна ў канцы паэмы павінна была спачатку збегчы з заканаым Анегіным.

Выпадкі, калі аўтар па розных прычынах змяняе першапачаткова задуманы фінал, не рэдкасць. Было такое і ў беларускай літаратуры. Давайце разам успомнім.

КАР'ЕРА ГАРЛАХВАЦКАГА

Калі ў 1940 годзе ў БССР абіралі п'есу для Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, нечакана для многіх спыніліся на востраактырычным спектаклі па п'есе «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы. Камедыя «Хто смяецца апошнім» была напісана ў 1939 годзе і па тым часе была надзвычай смелым творам. Нагадаю сюжэт: навуковым інстытутам кіруе нахабны і малапісьменны прыстасаванец. Ён хоча знішчыць таленавітага вучонага Чарнавуса. У інстытут выпадкова зайшоў чалавек у форме НКУС — і Гарлахвацкі пускае плётку, што «органы» зацікавіліся «ворагам народа» Чарнавусам... Імгненна ад навукоўца адварочваюцца ўсе. Адмаўляюцца дапускаць да лекцый, друкаваць яго кнігі... Другая ахвяра Гарлахвацкага — вучоны Туляга, пра яго распускаюць чуткі, што быў дзянікінскім палкоўнікам. Гарлахвацкі прыўлашчвае працу запалоханага Тулягі... Праўда, той, каб выкрыць невуцтва Гарлахвацкага, падсоўвае яму фэйкавае адкрыццё «свінтуса грандыёзуса», альбо мамантавай свінні. У п'есы хэпі-энд — дзякуючы прынцыповай моладзі, пільнаму парторгу і пастанове ЦК ВКП(б) «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні камуністаў з партыі...» махляр пакараны.

Паколькі быў заказ паказаць у Маскве сучасную Беларусь, а бяззубая драматургія пачынала надакучваць, чыноўнікі рызыкнулі. Але начальнік упраўлення па справах мастацтваў пры СНК СССР Храпчанка, праслухаўшы п'есу ў нумары атэля «Еўропа», заявіў, што гэта злосны паклёп на савецкую навуковую інтэлігенцыю. Выручыў першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка, які прызначыў чытку ў дванаццаць ночы ў сваім кабінеце і ўхваліў твор, праўда, зрабіўшы дзве заўвагі.

П'еса выклікала фурор у Маскве, яна дасюль актуальная... І толькі адзінкі ведалі, што шчаслівы фінал у ёй быў не заўсёды. У першапачатковым варыянце, калі махляра Гарлахвацкага выкрываюць, прыходзіць вестка пра ягонае павышэнне. Магчыма, яго пераводзяць у Маскву на яшчэ больш важную пасаду. Так што аўтар празрыста намякаў — усё працягваецца, і Гарлахвацкія застаюцца пры ўладзе... Магчыма, менавіта гэтага і тычылася заўвага Панамарэнкі — каб памяняць песімістычны фінал.

СМЕРЦЬ ПАЛІЦАЯ

Раман Івана Шамякіна «Вазьму твой боль», напісаны ў 1979 годзе, шукае адказ на пытанне «Ці ёсць апраўданне злу?» У сваю вёску пасля адбыцця пакарання вяртаецца былы паліцай Шышковіч па мянушцы Шышка. Іван Батрак, калгасны механізатар, не можа забыць, як Шышка калісь забіў на яго вачах усю ягоную сям'ю: цяжарную маці, маленькую сястрычку... Тым болей Шышка не змяніўся, ён гэткі ж эгаістычны, злосны, лжывы, небяспечны... Жонка Івана медсястра Таіса баіцца за сваю сям'ю. Аўтар доўга не мог напісаць канцоўку. Урэшце звярнуўся па параду да жонкі.

«Але пры стварэнні вобраза Таісы ў рамане «Вазьму твой боль» я мусіў зноў звярнуцца да Машы. З той толькі розніцай, што раман быў напісаны. Не было фіналу, нейкіх дзвюх старонак.

Маша прачытала, доўга думала, пасля сказала:

— Я яго забіла б.

Логіка сюжэта падводзіла да гэтага, але сацрэалізм не даваў мне права паслаць гераіню на злачынства.

Словы яе ашаламілі: мая Маша здольна на гэта?!

— Ды ты што? — расчаравана абурыўся я.

— А што? Каб ты пакутаваў так, як твой цёзка Іван Батрак? І каб гэты гад Шышка замахнуўся на цябе і асірацію нашых дзяцей?..

Жаночая душа — вялікая таямніца.

Я пайшоў на гэты фінал: Тася робіць Шышку ўкол.

Рэдактар «Полымя», мой сябра Кастусь Кірэенка, схапіўся за галаву:

— Што ты робіш, вялікі гуманіст! Ды нас з табой разнясуць у пух, у шмаццё.

Разнеслі б, напэўна.

Мусіў перапісаць фінал: сачыніў нешта аморфнае, не зусім пераканаўчае.

Здараецца ў аўтара так, што логіка характараў, развіцця сюжэта заводзіць у такія цянёты, адкуль не знаеш, як выбрацца. І дагэтуль не прыдумаў іншага фіналу, які праўдзіва завяршыў бы вельмі складаныя адносіны людзей, што завязаліся яшчэ ў вайну і былі паліты крывёю».

У выніку Таіса, якая прыходзіць да захваравалага Шышкі, не ўкалола яму замест лекаў атруту. Бо жонка Шышкі Марына расказвае медсястры, што яе муж учыніў чарговае злачынства.

«Паліцай падхапіўся з ложка, кінуўся да печы, схапіў сякеру. Ды не паспеў ён замахнуцца, як да яго кінулася Таіса Міхайлаўна і... выхапіла з рук яго сякеру...»

Дарэчы, сюжэт рамана ўзяты з рэальнага жыцця: у адной вёсцы жанчыны закалолі віламі паліцая, які вярнуўся пасля адбыцця турэмнага тэрміну.

ЯК ПАДЛІЧЫЦЬ ПРЫСТАСАВАНЦАЎ?

27 кастрычніка 1956 года ў газеце «Літаратура і мастацтва» быў надрукаваны верш Пімена Панчанкі «Прыстасаванцы», вельмі з'едлівы:

«Станкоў не знаюць, араць не ўмеюць,
Да воза з гноем не йдуць і блізка.
Разумнае, вечнае, добрае сеюць
Між мас працоўных амаль з калыскі.
Закончаць нешта з тугой нацяжкай,
Запас прыдбаюць цытатаў розных.
Дзяцей у школе вучыць ім цяжка,
Лягчэй, выгодней вучыць дарослых...
Ідуць насустрач грашовай справе,
На пафас голы яны не клюнуць.
Маліцца будуць, калі ты ў славе,
Калі ты ў горы — з насмешкай плюнуць».

Верш быў такі востры, што рэдакцыя запатрабавала ад паэта скарацiць апошнія дзве страфы. Гучалі яны так:

«А хто памкнецца іх быт парушыць,
Адразу трапіць у іх засаду —
Яны аблаюць, яны заглушаць
Яны задушаць салідным задам.
Я знаў на фронце, што вораг — вораг.
А як жа стукнуць
па гэтых мордах?
Між нас прыжыўся,
зашыўся ў норы
Прыстасаванцаў
агідны ордэн».

Панчанку давялося пісаць новую канцоўку верша, у якой сітуацыя змякчылася:

«Сярод народа
такіх не многа,
Ды вельмі ж хітра
яны нам шкодзяць.
Нам замінае
вось гэта погань,
Як пыл дарожны
ў цяжкім паходзе».

ПАН І РЭЧКА

У Заходняй Беларусі, якая знаходзілася пад польскай акупацыяй, самым улюбёным паэтам у простых беларусаў быў Міхась Васілёк. Ягоныя вершы чыталіся, завучваліся на памяць, перапісваліся... Літаратуразнаўца Уладзімір Калеснік расказваў гісторыю верша Васілька «Як я пана перанёс», які ў першай рэдакцыі называўся «Як я трапіў у камуністы»: *«Паэт Міхаіл Ісакоўскі пачуў яго ад насельніцтва ў часе вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў 1939 годзе і пераклаў на рускую мову як твор народны»*. У вершы польскі паліцэйскі патрабуе ад беларускага селяніна, каб той перанёс яго праз рэчку на ўласным карку.

У першай рэдакцыі селянін пакорліва нёс паліцэйскага, пакуль не заўважыў каля вуха рэвальвер: *«Гэткай штукі, далібог, // Я не бачыў зроду: // Сеў ад страху, а панок — // Ды бултых у воду!»* У выніку паліцэйскі арыштаваў мужыка як бунтаўшчыка-камуніста за замах на ўласную персону.

Калеснік расказвае: *«Васілёк палічыў патрэбным «перапісаць» гэты вобраз. Ён стварыў другую рэдакцыю верша, у якой селянін з напалоханага небаракі стаў дасціпным і смелым чалавекам, патрыётам і грамадзянінам. Знарок бултыхнуўшы паліцэйскага ў ваду, ён з гордасцю заяўляе: «Вось як вам на мужыку // Ездзіць ды глуміцца: // Давядзецца ездаку // Урэшце і ўтапіцца!» Канчатковы тэкст верша мог паўстаць толькі пасля вайны, калі Міхась Васілёк збавіўся ад уціску панскай цэнзуры і бачыў падзеі твора ў новай перспектыве часу»*.

ЗВОНКАЯ ЗАРАНКАВАЯ МЕДЗЬ НЕ ДАГАРАЕ

Верш Аркадзя Куляшова «Бывай», які зрабіўся знакамітай песняй, быў напісаны ў 1928-м годзе, калі аўтару споўнілася ўсяго чатырнаццаць. Твор быў надрукаваны ў часопісе «Полымя» ў маі таго ж года з падзагалоўкам «З блёкноту таварыша». Але пазней паэт вярнуўся да гэтага верша і істотна яго перарабіў, прыбраўшы не толькі свае юнацкія хібы, але і ўладную рэдактарскую руку Тодара Кляшторнага. У другім варыянце мы гэты твор і ведаем. Калі прааналізаваць змены, дык ад першапачатковай версіі застаўся няпраўленым толькі адзін радок, першы. Давайце ж параўнаем канцоўкі знакамітага твора. Вось апошняя страфа варыянта 1928 года:

«Бывай, абуджаная ў сэрцы, дарагая,
А мне так хочацца юнацтва сыпаць квець, —
На сэрцы палкае імкненьне расьцьвітае,
А ў словах звонкая, заранкавая медзь!..»

А вось канцоўка верша, якая на сёння лічыцца кананічнай:

«Бывай, абуджаная ў сэрцы, дарагая.
Твой светлы вобраз панясу я па жыцці.
На ўсходзе дня майго заранка дагарае,
Каб позна вечарам на захадзе ўзысці».

Згадзіцеся, у другім варыянце чуюцца інтанацыі сталага чалавека, які азіраецца на сваё жыццё. Звонкая, заранкавая медзь слоў юнага паэта ператвараецца ў заранку, якая дагарае на ўсходзе дня, каб узысці на захадзе ўвечары. Сімвал неўміручага кахання, святло якога суправаджае ўсё жыццё.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Любыя дачныя работы плануем, перш за ўсё абапіраючыся на клімат свайго рэгіёна і прагноз надвор'я, бо ў сакавіку на поўначы яшчэ холадна, а ў паўднёвых абласцях ужо цёпла.

Варта ведаць

✓ Калі на агурочнай градцы пасадзіць сланечнік, ураджайнасць агуркоў узрасце і плоданасіць яны будуць даўжэй.

✓ Яблыню і вішню не саджайце побач: іх карані дзейнічаюць прыгнятальна адно на аднаго.

✓ Калі пад яблыняй пасадзіць піжму або палын, яны абароняць дрэва ад пладажоркі. Абараняе ад шкоднікаў і бузіна.

✓ Калі на агуркі напала тля, заварыце кіпенем шклянку попелу, дайце пару гадзін настаяцца, развядзіце ў пяці літрах вады і апырскайце расліны.

✓ Больш за ўсё патрабуюць вады тыя расліны, у якіх карані невялікія, а лісты буйныя: радыс, салата, агуркі, капуста, кабачкі.

✓ Настой аксамітак — выдатны сродак супраць тлі. Расліны зразаюць падчас цвіцення, сушаць у цені. Паўвядра сухіх аксамітак заліваюць вядром вады, настойваюць двое сутак, а пасля гэтага апырскваюць пашкоджаныя расліны, дадаўшы мыльную стружку.

✓ Знішчае тлю, вусеніц і лістагрызучых жукоў адвар і настой сцёблаў і каранёў дэльфініуму. На адну частку травы бяруць 10 частак вады, двое сутак настойваюць і апырскваюць пашкоджаныя расліны.

✓ Матылі-капусніцы не выносяць паху календулы і бацвіння таматаў. Яны не залазяць на тыя градкі, дзе гэтыя расліны раскладзены ў міжраддзях капусты.

✓ Яшчэ адзін сродак ад тлі — дзьмухавец. Бяруць 400 г лістоў гэтага пустазелля, заліваюць вядром цёплай вады, настойваюць суткі, дадаюць крыху мыльнай стружкі і апырскваюць настоем пашкоджаныя расліны.

НАЙЛЕПШЫ ЧАС ДЛЯ АБРАЗАННЯ ПЛАДОВЫХ ДРЭЎ У САДЗЕ

Калі з пасадкай расады або падрыхтоўкай цяпліцы да новага сезона можна прыпазніцца на пару тыдняў, то з абразаннем марудзіць ніяк нельга!

Пачнецца рух соку, расліны прачнуцца, і абразанне ўжо прынясе шкоду, а не карысць. Але і рабіць гэта ў лютыя маразы таксама немэтазгодна: замёрзлая драўніна ў месцах зрэзу галінак і сучкоў будзе крышыцца і дрэнна гаіцца.

Раны, якія засталіся на дрэве, паслужаць прычынай заражэння інфекцыйнымі або грыбковымі хваробамі.

Як жа правільна вызначыць удалы момант у любой мясцовасці?

Усё проста: мінімальная тэмпература паветра не ніжэй за -10 °С і не вышэй за 5 °С для яблынь, не ніжэй за -6 °С і не вышэй за 5 °С для костачкавых дрэў і ягадных кустоў.

Арыентавацца неабходна на начную (самую нізкую) тэмпературу паветра.

Яна мусіць быць стабільнай некалькі дзён. Маразы, якія набліжаюцца па прагнозе надвор'я, — стоп-сігнал для правядзення абрэзкі.

Чакаецца рэзкае пацяпленне? Пачакайце, пакуль кара адаптуецца да цяпла, калі дзённыя і начныя тэмпературы будуць стабільныя хоць бы некалькі дзён запар.

Якія правілы абрэзкі?

Існуюць толькі агульныя рэкамендацыі, не заўсёды карысныя для канкрэтнага дрэва. Напрыклад, колькі шкілетных галін пакінуць?

На яблынях рэкамендуецца пакідаць 5-7 шкілетных галін, на костачкавых культурах — не менш за 8-9. Усё залежыць ад узросту культуры, плоданашэння, гадавога прыросту, стану кары на штамбе і старых галінах.

Акрамя таго, улічвайце кірунак росту шкілетных галін, не спрабуючы адразу зразаць усе, якія растуць «няправільна». У адваротным выпадку пасля абразання не будзе ўраджаю.

Пасля любога абразання варта разаслаць плёнку або тканіну пад дрэвам і зачысціць кару ствала і ніжніх галін ад лішайнікаў, імхоў, шкоднікаў, якія зімуюць пад карой, раслінная смецця.

Выкарыстоўвайце цвёрдую шчотку (не металічную), якая добра чысціць, але не пашкоджвае кару. Плёнку разам са смеццем акуратна складзіце, перанясіце смецце далей ад дрэва і спаліце.

Санітарнае абразанне праводзіцца кожны год на ўсіх культурах: выдаляюцца зламаныя, сухія, пашкоджаныя шкоднікамі або хваробамі галіны. Для дрэў, якія растуць у зоне рызыкоўнага земляробства, санітарнае абразанне павінна ўключаць яшчэ і выдаленне загушчаных галін (разрэджана-яруснае абразанне).

Фармавальная стрыжка або абразанне з мэтай палепшыць плоданашэнне выконваецца адзін раз на два-тры гады для старых пладовых дрэў і яшчэ радзей — для маладых. За адзін прыём не выдаляйце больш за траціну шкілетных галін, інакш дрэва перастане пладаносіць.

Зрэзы робяцца вострай пілой з дробнымі зубамі. Акуратны гладкі зрэз — залог здароўя галінкі, што засталася. Пры тэмпературы ніжэй за 8 °С замазваць зрэзы пажадана толькі праз дзве-тры гадзіны, каб свежая драўніна падсохла. Для абмазкі ўжываецца садовы вар ці алейныя фарбы. Зрэзы, дыяметр якіх меншы за 1 см, можна пакідаць адкрытымі, без абмазкі.

Выдаленне лішніх пладовых пупышак — такі ж важны прыём, як і абразанне галінак. Пладовыя пупышкі, якія глядзяць уніз, таксама выдаляюцца.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.40	19.01	11.21
Віцебск —	7.31	18.50	11.19
Магілёў —	7.30	18.51	11.21
Гомель —	7.26	18.49	11.23
Гродна —	7.55	19.17	11.22
Брэст —	7.54	19.19	11.25

Месяц

Поўня 7 сакавіка.
Месяц у сузор'і Шаляю.

Імяніны

Пр. *Івана.*
К. *Катарыны, Францішка, Дамініка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Мама, я прыгожая?

— Спытай лепш у свайго хлопца.

— У якога хлопца?

— Вось іменна!

Я разношу па пад'ездах бясплатныя газеты, забяспечваючы тым самым пенсіянераў праграмай тэлепередач на наступны тыдзень. Пры знаёмствах з дзяўчатамі прадстаўляюся проста: спецыяліст па праграмным забеспячэнні.

Калі вы думаеце, што курэнне не ўплывае на голас жанчыны, паспрабуйце пры ёй стрэсці попел на дыван.

Усё! Вырашыла, якую сумачку хачу на 8 Сакавіка. Інкасатарскую!

Даты. Падзеі. Людзі

9 САКАВІКА

У краіне

1908 год — нарадзіўся Мікалай Васілевіч Дранько, беларускі спартсмен і трэнер (веласіпедны спорт). Першы беларускі ўдзельнік IX Алімпійскіх гульняў (1928 г., заняў пятае месца ў гонках на трэку). Першы заслужаны трэнер Беларусі па веласіпедным спорце.

1963 год — нарадзілася Алена Фёдараўна Кірэева, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праблемах падаткаабкладання, рэфармавання і ўдасканаленні нацыянальнай сістэмы ва ўмовах уступлення Рэспублікі Беларусь у рэгіянальныя эканамічныя сувязі.

У свеце

1908 год — нарадзіўся Леанід Аляксандравіч Кміт, кінаакцёр, заслужаны артыст Расіі.

У 1930—1938 гадах працаваў на кінастудыі «Савецкая Беларусь». У беларускім кіно стварыў шэраг драматычных і камедыйных вобразаў. У 1934-м на студыі «Ленфільм» сыграў ролю Пецькі ў фільме «Чапаеў». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1941).

1918 год — нарадзіўся Мікі Спілейн, амерыканскі пісьменнік. Аўтар папулярных раманаў аб прыватным дэтэктыве Майку Хамеры.

2018 год — пачаліся XII Паралімпійскія гульні. Зімовыя Гульні ў Пхёнчхане сталі самымі паспяховымі для беларускіх паралімпійцаў. У іх актыве 12 медалёў (чатыры залатыя, чатыры сярэбраныя, чатыры бронзавыя). Зборная Беларусі заняла восьмае месца ў медальным заліку.

Так гаварыў...

ВІКТОР ГЮГО:

«Асёл, які ведае дарогу, варты большага, чым прадказальнік, які мяркуе наўздагад».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.681. Індэкс 63850. Зак. № 646.

Нумар падпісаны ў 19.30

8 сакавіка 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12